## Нашы знакамітыя землякі

# Узыходжанне творцы

Р. Ф. Шаура нарадзіўся 30 жніўня 1944 года ў вёсцы Малы Поўсвіж. Вучыўся ў Поўсвіжскай сямігодцы, у СШ № 2 г. Лепеля. Пасля заканчэння школы працаваў у Лепельскай міжкалгаснай будаўнічай арганізацыі, служыў у арміі. Пасля службы паступіў у Віцебскі педагагічны інстытут на мастацка-графічны факультэт, потым закончыў аспірантуру інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору АН Беларусі, абараніў кандыдацкую дысертацыю.

З 1977 года Р. Ф. Шаура працуе ў Беларускім дзяржаўным універсітэце культуры. Па яго ініцыятыве з 1990 года распачата падрыхтоўка спецыялістаў па спецыялізацыі "народныя рамёствы". Дзякуючы намаганням Р. Ф. Шауры, упершыню ў ВНУ рэспублікі была створана кафедра народных рамёстваў. Апошняя вырасла ў вялікае вучэбна-творчае падраздзяленне універсітэта, аб'яднаўшы больш дваццаці лепшых спецыялістаў у галіне народнага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва. Толькі за апошнія 10 гадоў падрыхтавана звыш 350 спецыялістаў.

Кафедра, якую ўзначальвае Рыгор Фёдаравіч Шаура, вядзе актыўную навукова-творчую работу ў галіне народнага мастацтва. Адраджаюцца і развіваюцца шматлікія традыцыйныя віды: абварная і задымленая кераміка, саломапляценне, узорнае ткацтва, роспіс тканіны і інш. Акрамя таго, вядзецца вялікая эксперыментальна-даследчая работа па ўкараненню традыцыйных узораў ужытковага мастацтва ў навучальны і творчы працэс.

Р. Ф. Шаура апублікаваў звыш 70 навуковых прац, з іх



8 манаграфій і падручнікаў: "Міхась Засінец", "Гаўрыла Вашчанка", "Альгерд Малішэўскі", "Леанід Дударанка", "Лілія Трахалева", "Пейзаж у беларускім жывапісе", "Перспектыва ў малюнку і жывапісе", "Малюнак у навучальным працэсе", "Самадзейнае выяўленчае мастацтва Беларусі" і інш. Гэтыя працы шырока выкарыстоўваюцца як у навучальным працэсе ВНУ, так і навукоўцамі рэспублікі.

Падрыхтавана таксама да выдання манаграфія "Дэкаратыўны і станковы жывапіс у народным мастацтве Беларусі XIX — XX стагоддзяў", якая пашырае нашы веды аб духоўнай спадчыне Беларусі. Студэнты і выпускнікі кафедры народнага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва актыўна ўключаны ў мастацка-творчы працэс. У рэспубліцы пастаянна арганізуюцца выставы вучэбных і творчых работ студэнтаў і выпускнікоў спецыялізацыі "народныя рамёствы". За перыяд 1999 — 2002 гг. 40 студэнтаў Беларускага дзяржаўнага універсітэта культуры сталі лаўрэатамі прэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы таленавітай моладзі, пераможцамі святаў-конкурсаў у галіне народнага мастацтва як на рэспубліканскім, так і міжнародным узроўні. У 2001 — 2002 гг. на Міжнародных конкурсах высокай моды нацыянальнага касцюма (Масква, Мінск) выхаванцы спецыялізацыі таксама сталі лаўрэатамі конкурса, а касцюм "Чароўная пані", як дыпломная работа выпускнікоў кафедры, атрымаў міжнародны дыплом "Гран-пры".

Рыгор Фёдаравіч з'яўляецца членам Саюза мастакоў Беларусі. Як мастак-акварэліст — ён удзельнік 22 рэспубліканскіх і міжнародных выстаў. Яго творчыя работы знаходзяцца ў прыватных галерэях Італіі, Германіі, Англіі, Нарвегіі і іншых краін Заходняй Еўропы.

У адпаведнасці з Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь у 2000 годзе Р. Ф. Шауру быў уручаны дыплом лаўрэата прэміі "За духоўнае адраджэнне", а ў 2001 годзе за выдатныя заслугі ў развіцці вышэйшай школы Рыгор Фёдаравіч атрымаў спецыяльную стыпендыю Прэзідэнта.

Заслугі Р. Ф. Шауры на ніве падрыхтоўкі і выхавання маладога пакалення, у сферы мастацкай культуры, развіцці нацыянальнага мастацтвазнаўства, мастацка-творчага працэсу — бясспрэчныя. Як чалавек, адданы гэтай вялікай справе, ён уносіць значны ўклад у духоўнае адраджэнне Радзімы.

Лепельскі раённы Савет дэпутатаў, аддзел культуры, Дом народных рамёстваў, раённы краязнаўчы музей, усе лепяльчане віншуюць нашага земляка, прафесара, лаўрэата прэміі Прэзідэнта "За духоўнае адраджэнне" Рыгора Фёдаравіча ШАУРУ з нагоды 60-годдзя з дня нараджэння.

Жадаем Вам, шаноўны Рыгор Фёдаравіч, моцнага здароўя і далейшых поспехаў у Вашай высакароднай справе.

**Наш кар.**